3. Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. / рэдкал. : С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Мінск : Навука і тэхніка, 1987–1994.
4. Арт-ликбез: что такое фовизм и чем его пишут? [Электронный ресурс]. URL: brunch.lv/art-likbez-chto-takoe-fovizm-i-chem-ego-pishut (дата обращения: 01.09.2019).
5. Великие художники XX века / авторы-составители: П. С. Богданов, Г. Б. Богданова. М. : Мартин, 2001. 479 с.

## СУЧАСНАЕ МАНУМЕНТАЛЬНА-ДЭКАРАТЫЎНАЕ МАСТАЦТВА Ў ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ ІНТЭРНЭТУ

***А. П. Багданаў***

*Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў,*
*пр. Незалежнасці, 81, 220012, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*donald-bogdanov@mail.ru*

Манументальна-дэкаратыўнае мастацтва – адзін з самых запатрабаваных на Беларусі і ў іншых краінах відаў сучаснага мастацтва. У артыкуле аналізуецца, наколькі адэкватна прадстаўлена манументальна-дэкаратыўнае мастацтва ў прасторы інтэрнэту. Даюцца канкрэтныя парады па ўдасканаленні інфармацыйных рэсурсаў, дакладнасці прадстаўленай інфармацыі. Артыкул дапаможа выкладчыкам, настаўнікам, студэнтам, вучням, журналістам і ўсім, хто цікавіцца мастацтвам, арыентавацца ў тэарэтычным і практычным аспектах рэпрэзентацыі твораў манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

***Ключавыя словы:*** манументальна-дэкаратыўнае мастацтва; інтэрнэт.

## MODERN MONUMENTAL AND DECORATIVE ART IN THE INFORMATION SPACE OF THE INTERNET

***A. P. Bagdanau***

*Belarusian state Academy of arts,*
*4, Nezalezhnasci Av., 220030, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A. P. Bagdanau (donald-bogdanov@ mail.ru)*

Monumental and decorative art is one of the most popular types of contemporary art in Belarus and other countries. The article analyzes how adequately represented monumental and decorative art in the space of the Internet. Specific advice on improving information resources, the reliability of the information pro-

vided. The article will help teachers, teachers, students, students, journalists and anyone interested in art to navigate the theoretical and practical aspects of the representation of works of monumental and decorative art.

***Keywords:*** monumental and decorative art; Internet.

Тэрмін «манументальна-дэкаратыўнае мастацтва» нават спецыялісты пачалі ўжываць адносна нядаўна. Таму і ў друкаваных энцыклапедычных выданнях, і ў інтэрнэт-прасторы дакладна адназначнага тлумачэння гэтага віду мастацтва знайсці практычна немагчыма [1; 2; 3; 4]. «Манументальна-дэкаратыўнае мастацтва» – тэрмін, які да апошняга часу ўжываўся «як сінонім манументальнага мастацтва ці для абазначэння кірунку манументальнага мастацтва, дзе пераважае дэкаратыўная аснова» [3, с. 91]. Гэткая тэрміналагічная недакладнасць абумоўлена тым, што толькі ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя манументальна-дэкаратыўнае мастацтва набывае свае адметныя рысы, складваюцца нацыянальныя школы манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. Выкладчыкам, журналістам, студэнтам даводзіцца карыстацца рознымі інфармацыйнымі крыніцамі, а часцей прадстаўленым ілюстрацыйным матэрыялам, каб на яго аснове вызначыць, ці можна далучыць той або іншы твор да манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

Што датычыцца тэорыі, варта нагадаць: інфармацыя ў друкаваныя энцыклапедычныя выданні трапляе толькі пасля сур’ёзнага рэдагавання, рэцэнзій дасведчаных спецыялістаў. Інтэрнэтаўскія аўтары часцей карыстаюцца досведам аўтараў друкаваных выданняў, але, здараецца, недакладна ўжываюць тэрміны, выкарыстоўваюць выпадковыя факты.

З аднаго боку, інтэрнэт больш мабільны, чым друкаванае выданне, артыкул там можна ўдакладніць, выправіць. Але, з іншага – праўкі гэтыя могуць быць недакладнымі. Вельмі часта аўтары віртуальнай прасторы карыстаюцца не толькі энцыклапедычнымі выданнямі, але і газетамі, часопісамі, што значна зніжае якасць здабытай такім чынам інфармацыі.

Самая ж галоўная перавага інтэрнэту, якую, на жаль, на сёння мы выкарыстоўваем далёка не на сто працэнтаў, – гэта магчымасць уключаць у артыкулы шмат каляровага ілюстрацыйнага матэрыялу, а гэта для ўсяго выяўленчага мастацтва найвялікшая дапамога. Перыядычныя друкаваныя выданні і сёння не толькі па-ранейшаму з’яўляюцца крыніцай інфармацыі, але і закранаюць праблемы, часам, дзякуючы дасведчаным спецыялістам, прапануюць шляхі іх вырашэння, што, на жаль, не асвоіў інтэрнэт [5; 6; 7]. Паколькі ў пошуках адказу на тое ці іншае пытанне

сучасны чалавек найперш звяртаецца да інтэрнэту, мы прааналізавалі інфармацыйныя прасторы дзвюх найболь папулярных на Беларусі пошукавых сістэм – «Яндэкс» і «Гугл». Варта адзначыць, што аб’ём і скіраванасць інфармацыі па манументальна-дэкаратыўным мастацтве істотна не адрозніваюцца. Таму мы палічылі магчымым абагульніць нашы назіранні, акцэнтаваць і ўдакладніць некаторыя пытанні тэорыі і практыкі сучаснага манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

Пачнем з вызначэння. Нават у нядаўна выдадзеных дзяржаўных дакументах (Пастанова СМ РБ № 1372 ад 19.09.2008) [8], якія можна знайсці паводле спасылак пры вызначэнні адраса пошуку «сучаснае манументальна-дэкаратыўнае мастацтва», зафіксаваныя «манументальная скульптура», «манументальна-дэкаратыўная скульптура», «манументальны жывапіс», «дэкаратыўна-аздабленчыя формы». Пры гэтым «манументальны жывапіс» прэзентуецца як «творы (карціны, мазаіка, вітраж, роспіс і інш.), выкананыя ў тэхніках фрэскі, мазаікі, вітража, тэмпернага, алейнага, васковага жывапісу, у змешанай тэхніцы, сграфіту, прызначаныя для канкрэтнага архітэктурнага асяроддзя» [8].

Мяркуем, што больш дакладна якраз да гэтага вызначэння падыходзіць назва «манументальна-дэкаратыўнае мастацтва». Вызначальнымі тут будуць не толькі жывапісныя, але і чыста дэкаратыўныя матэрыялы (мазаіка, вітраж).

У Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў шмат гадоў плённа працуе кафедра манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. І сайт кафедры (яго зрабіла лабарант Кацярына Іванаўна Мельнік) дае шмат карыснай інфармацыі, ілюстрацыі, дзе ёсць творы, ёсць аўтары, якія вызначаюць сёння аблічча сучаснага манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. Нейкім чынам якраз гэтая інфармацыя запаўняе інфармацыйны вакуум.

Ёсць інфармацыя, якая будзе карысная для тых, хто піша пра манументальна-дэкаратыўнае мастацтва, прэзентаваная ў інтэрнэце секцыяй манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Саюза беларускіх мастакоў.

Але сустракаюцца зусім выпадковыя інфармацыйныя блокі. Напрыклад, «Шамрук // Сучаснае манументальна-дэкаратыўнае мастацтва» [8]. А. Шамрук, мастацтвазнаўца, сапраўды шмат пісала пра манументальна-дэкаратыўнае мастацтва. Але ў гэтым выпадку чамусьці прапануецца матэрыял пра гравюры (графіка!) у віленска-еўеўскіх выданнях XVII стагоддзя.

Нам уяўляецца, што на сёння інфармацыя мусіць быць дакладнай, больш сістэматызаванай.

Мы мусім знайсці:

1) вызначэнне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. Хаця б некалькі фактаў з гісторыі;

2) інфармацыю пра тэхнікі і тэхналогіі (з ілюстрацыямі і спасылкамі для тых, хто шукае больш падрабязную інфармацыю);

3) імёны мастакоў-манументалістаў, рэпрадукцыі іх найлепшых твораў;

4) спіс літаратуры;

5) звесткі пра кафедру МДМ у БДАМ;

6) ілюстрацыі з творамі МДМ мінулых гадоў і нядаўна створаныя.

Толькі некалькі фактаў, якія мы маглі б знайсці, набраўшы ў інтэрнэце «манументальна-дэкаратыўнае мастацтва». Пачынаецца рэстаўрацыя класічных ужо твораў А. Кішчанкі на дамах ля станцыі метро «Усход». Дарэчы, і станцыі мінскага метро былі аздоблены выдатнымі мастакамі-манументалістамі. Іх імёны мусяць ведаць нашы сучаснікі. А колькі твораў МДМ у Палацы Незалежнасці, Палацы Рэспублікі, новым рэканструяваным будынку Савета Рэспублікі, Міністэрстве замежных спраў. Асобная гаворка пра аздабленне культавых будынкаў. Гэта ўнікальныя мазаікі Храма Усіх Святых, аздабленне царквы ў Вішневе Валожынскага раёна і г. д. Мы можам і павінны ведаць тых, хто аддае свой талент дзеля будучыні. Немагчыма ўявіць, што ў эпоху інтэрнэту нашы нашчадкі будуць вышукваць імёны аўтараў твораў манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, якія ствараюцца ў наш час.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Баразна М. Р. Гісторыя выяўленчага мастацтва Беларусі ХХ стагоддзя. Мінск : УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», 2016.
2. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Т. 6. Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1998.
3. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Т. 10. Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2000.
4. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Т. 15. Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2002.
5. Валериус С. С. Монументальная живопись: современные проблемы. М. : Искусство, 1979. 87 с.
6. Виннер А. В. Материалы и техника монументально-декоративной живописи. Стенная, плафонная и декоративная живопись. М. : Искусство, 1953. 755 с.
7. Воейкова И. Н. Монументальное искусство и современные проблемы синтеза // Синтез искусств и архитектура общественных зданий : сб. ст. М. : Советский художник, 1974. 254 с.

8. Белзакон. net. [Электронный ресурс]. URL: belzakon.net (дата обращения: 01.09.2019).
9. Белорусская государственная академия искусств. Кафедра монументально-декоративного искусства [Электронный ресурс]. URL: bdam.by>by/art_fackty/department_monumental_ decorative_arts/ (дата обращения: 01.09.2019).

## КИТАЙСКИЕ ЛИБЕРАЛЬНЫЕ ИНТЕЛЛЕКТУАЛЫ ЖУРНАЛА «THE CHINA CRITIC» О СИНОЛОГИИ

***Д. Н. Гиргель***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*dhirhel@gmail.com*

Авторы китайского общественно-политического журнала на английском языке «The China Critic» (1928–1946), китайские либеральные интеллектуалы, обращаются к вопросам становления и развития синологии на Западе, анализируют задачи синологии в контексте дискуссий о модернизации Китая.

***Ключевые слова:*** интеллектуальная история Китая; «The China Critic»; синология.

## CHINESE LIBERAL INTELLECTUALS OF «THE CHINA CRITIC» JOURNAL ABOUT SYNOLOGY

***D. N. Hirhel***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: D. N. Hirhel (dhirhel@gmail.com)*

The authors of the Chinese socio-political journal in English «The China Critic» (1928–1946), Chinese liberal intellectuals, address the issues of the formation and development of Sinology in the West, analyze the tasks of Sinology in the context of discussions about the modernization of China.

***Keywords:*** intellectual history of China; The China Critic; Sinology.

«The China Critic» (Zhongguo ping lun zhou bao,中國評論週報, 1928–1946), первый еженедельный журнал на английском языке, выпускаемый и редактируемый группой китайских интеллектуалов, был основан 31 мая 1928 года в Шанхае, беспрерывно издавался до 1940 года, после